Аляксандар Ціхаміраў

# РАСІЯ Ў ВОНКАВАЙ ПАЛІТЫЦЫ АФІЦЫЙНАГА МЕНСКУ

Пры разглядзе пытаньня аб месцы Расіі ў вонкавай палітыцы Рэспублікі Беларусі трэба заўважыць, што ў мінулым дзесяцігодзьдзі наша краіна ня выпрацавала афіцыйна зацьверджанай канцэпцыі вонкавай палітыкі. Распрацоўка такога дакумэнту пачалася ўвосень 1991 г., пасьля здабыцьця Беларусяй незалежнасьці. 2 кастрычніка 1991 г. пры абмеркаваньні пытаньня “Аб вонкавапалітычнай дзейнасьці Рэспублікі Беларусі” старшыня парлямэнцкай камісіі ў міжнародных справах і вонкаваэканамічнай дзейнасьці Пётра Садоўскі выказаў гатовасць распрацаваць вонкавапалітычную дактрыну для Беларусі.

У канцы 1992 г. Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусі падрыхтавала праект дакумэнту пад назовам “Канцэпцыя вонкавапалітычнай дзейнасьці Рэспублікі Беларусі”. У пачатку 1993 г. дакумэнт быў разгледжаны Прэзыдыюмам Вярхоўнага Савету РБ, але не атрымаў дадатнай ацэнкі і быў накіраваны на дапрацоўку.

Наступны праект вонкавапалітычнай канцэпцыі пад назовам “Асноўныя кірункі вонкавапалітычнай і вонкаваэканамічнай дзейнасьці Рэспублікі Беларусі” быў падрыхтаваны парлямэнцкай камісіяй у міжнародных справах і вонкаваэканамічнай дзейнасьці і прадстаўлены на абмеркаваньне Вярхоўнага Савету ў студзені 1994 г. Аднак да разгляду дакумэнту справа не дайшла. Адпаведнае пытаньне было зьнятае з парадку дня на просьбу старшыні камісіі Івана Цярэшкі, які спаслаўся на немагчымасьць дакладнай фіксацыі кірункаў вонкавапалітычнай і вонкаваэканамічнай дзейнасьці Беларусі ўва ўмовах вызначанага ўрадам Вячаслава Кебіча курсу на збліжэньне з Расіяй[1].

У жніўні 1994 г. Старшыня Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі Мечыслаў Грыб на нарадзе кіраўнікоў дыпляматычных і консульскіх установаў Беларусі за мяжой паставіў пытаньне аб неабходнасьці распрацоўкі і прыняцьця парлямэнтам канцэпцыі вонкавай палітыкі Рэспублікі Беларусі. Пытаньне аб прыняцьці Закону “Аб асноўных кірунках вонкавапалітычнай і вонкаваэканамічнай дзейнасьці Рэспублікі Беларусі” было ўнесенае ў парадак дня чарговай сэсіі Вярхоўнага Савету. Планавалася, што яно будзе разгледжана ў пачатку 1995 г., але і гэтая спроба прыняцьця беларускай вонкавапалітычнай канцэпцыі за-

кончылася безвынікова.

Прэзыдэнт А. Лукашэнка ставіўся да тэарэтычнай выпрацоўкі вонкавапалітычнай дактрыны абыякава. У жніўні 1995 г. падчас выступу на пашыранай калегіі МЗС ён ува ўласцівай яму дэмагагічнай манеры падкрэсьліў, што вонкавая палітыка Беларусі будзе праводзіцца не на падставе поглядаў палітыкаў, а на падставе жаданьняў беларускага народу[2].

Толькі ў другой палове 1990-х гадоў афіцыйныя органы (Рада бясьпекі, МЗС і г.д.) пачалі выпрацоўваць дакумэнты, дзе рабіліся спробы вызначыць месца Рэспублікі Беларусі на міжнароднай арэне. У 1997 г. быў створаны Інстытут сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў пры Адміністрацыі прэзыдэнта РБ, які меўся генэраваць інтэлектуальныя прапановы ў розных пытаньнях жыцьця беларускай дзяржавы, у тым ліку і ў пытаньнях вонкавае палітыкі. Аднак афіцыйна зацьверджанае вонкавапалітычнае канцэпцыі Рэспубліка Беларусь дагэтуль так і не дачакала. Таму дыпляматыя незалежнай беларускай дзяржавы ў 1990-х гг. кіравалася ў сваёй дзейнасьці не тэарэтычнымі напрацоўкамі спэцыялістаў-міжнароднікаў, а ўстаноўкамі вышэйшых кіраўнікоў Беларусі, прычым адпаведныя ўстаноўкі часта грунтаваліся на іхных уласных уяўленьнях аб сьвеце.

Прасочым, як ставіліся да пытаньня разьвіцьця ўзаемаадносінаў з Расіяй найвышэйшыя службовыя асобы Рэспублікі Беларусі.

Па здабыцьці незалежнасьці Рэспубліка Беларусь ладзіла свае адносіны з Расіяй як з замежнай дзяржавай і першапачаткова не фармулявала свайго асаблівага стаўленьня да яе. Напрыклад, міністар замежных справаў Рэспублікі Беларусі Пётра Краўчанка ў выступе на сэсіі Генэральнай Асамблеі ААН у кастрычніку 1992 г., характарызуючы канцэптуальныя асновы вонкавай палітыкі Беларусі, не вылучаў адносінаў з Расіяй у якасьці прыярытэтнага кірунку беларускай дыпляматыі, аддаючы перавагу развою супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі ў рамках СНД[3]. Адпаведная думка праводзілася ў і праекце канцэпцыі вонкавай палітыкі, распрацаваным МЗС РБ у канцы 1992 г.

Разам з тым Старшыня Савету міністраў Рэспублікі Беларусі В. Кебіч уважаў, што сувязі паміж Беларусяй і Расіяй павінны мець адмысловы характар. У інтэрвію БелТА ў чэрвені 1992 г. ён падкрэсьліў, што беларускі ўрад павінен захоўваць добрыя адносіны з Расіяй, паколькі адпаведная краіна займае найвялікшае месца ў супольным ВУП краінаў СНД. "...У дзелавых і ўзаемавыгадных адносінах зь вялізнай краінай мы бачым вялікія магчымасьці для дынамічнага разьвіцьця Беларусі", — заўважыў ён[4]. У ліпені 1992 г. падчас візыту ў Маскву В. Кебіч ня выключыў магчымасьці стварэньня канфэдэрацыі Беларусі й Расіі пры разьвіцьці міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў сфэры эканомікі[5].

У сакавіку 1993 г. у выступе на нарадзе-сэмінары кіраўнікоў выканкамаў гарадзкіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў В. Кебіч зьвярнуў увагу на тое, што Расія мае значную колькасьць прадпрыемстваў-дублёраў і таму можа зь лёгчынёй ствараць у сябе аналягічныя магутнасьці. Таксама ён заўважыў, што расійскія прадпрыемствы адмаўляюцца набываць прадукцыю





беларускіх прадпрыемстваў (шыны, шасьцерні, калійныя ўгнаеньні) з прычыны іх дарагоўлі і высокіх выдаткаў, зьвязаных зь іх транспартаваньнем. Пераламіць складаную сытуацыю, у якой апынулася Беларусь, на думку В. Кебіча, магло б толькі стварэньне эканамічнага саюзу ў рамках СНД[6]. У пачатку красавіка 1993 г. кіраўнік беларускага ўраду ў выступе на сэсіі ВС заўважыў, што аснову такога саюзу маглі б скласьці Беларусь, Расія і Казахстан[7]. У чэрвені 1993 г. В. Кебіч скарэктаваў сваю пазыцыю. У выступе перад слухачамі Акадэміі кіраваньня пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусі ён заявіў: "...Магчымасьць эканамічнага саюзу паміж Беларусяй, Расіяй і Казахстанам, на што мы разьлічвалі, практычна страчаная. Цяпер ёсьць падставы гаварыць толькі аб саюзе з Расіяй"[8].

Увесну 1993 г. Кебічаў урад выступіў з ініцытывай прылучэньня Беларусі да сыстэмы калектыўнай бясьпекі СНД, створанай у 1992 г. Гэта матывалася тым, што знаходжаньне ў ёй дасьць магчымасьць беларускаму ВПК супрацоўнічаць з расійскімі прадпрыемствамі адпаведнага профілю ў стварэньні новых відаў узбраеньняў, а гэта палепшыць становішча беларускай прамысловасьці. У якасьці аргумэнту выкарыстоўвалася і тое, што Беларусь ня можа быць нэўтральнай, пакуль на яе тэрыторыі знаходзяцца расійскія вайскоўцы і ядравыя ракеты. Выступаючы за цясьнейшае супрацоўніцтва з Расіяй у вайсковай сфэры, В. Кебіч заяўляў, што Беларусь ня будзе накіроўваць сваіх вайскоўцаў у "гарачыя кропкі" на прасторы СНД, калі тыя самі не пажадаюць таго[9].

Увосень 1993 г. беларускі ўрад паставіў пытаньне аб стварэньні адзінай рублёвай зоны з Расіяй. В. Кебіч у выступе на сэсіі ВС у лістападзе 1993 г. аргумэнтаваў гэты крок тым, што ўвядзеньне адзінай валюты дазволіць хутка вырашыць праблему міждзяржаўных разьлікаў, створыць умовы для больш хуткага і спрошчанага аб'яднаньня капіталу праз акцыянэрныя таварыствы, карпарацыі і г.д.[10]. Разам з тым Кебіч уважаў, што аб'яднаньне ня будзе лёгкай справай. "Мы — дзяржавы з сваімі ўласнымі заканадаўчай базай, грашова-крэдытнай і падаткова-бюджэтнай сыстэмамі, цэнавай і мытнай палітыкай, сваімі захадамі сацыяльнай абароны насельніцтва. Таму наіўна думаць аб аўтаматызьме аб'яднаньня ці аб тым, што аб'яднаньне дасьць выгаду ў аднабаковым і імгненным парадку", — гаварыў Кебіч[11].

Старшыня Прэзыдыюму ВС Станіслаў Шушкевіч, які сумяшчаў пасады кіраўніка дзяржавы і кіраўніка парлямэнту, не выступаў супраць збліжэньня з Расіяй. У лютым 1992 г. у інтэрвію газэце "Монд" ён падкрэсьліваў: "Мы ідзём да незалежнасьці, але не ўяўляем сабе нават у доўгатэрміновай пэрспэктыве такага падзелу з Расіяй, які можа сябе дазволіць Украіна"[12]. У жніўні 1993 г. у інтэрвію радыёстанцыі "Голас Амэрыкі" С. Шушкевіч заявіў: "...Ніколі ня будзе прызнаны палітык, які хоча будаваць сьветлую будучыню Беларусі на пагаршэньні адносінаў з Расіяй. Гэты шлях для нас гібельны... Іншае пытаньне, што мы павінны будаваць з Расіяй здаровыя эканамічныя адносіны. Мы маем шэраг двухбаковых дагавораў, і мы задаволены гэтым, ня маем ніякіх прэтэнзіяў

адзін да аднаго, як, дарэчы, і да ўсіх астатніх нашых суседзяў”[13].

У лістападзе 1993 г. С. Шушкевіч дапускаў магчымасьць таго, што цясьнейшае супрацоўніцтва з рэфармаванай Расіяй паскорыць рэформы ў Беларусі. “Вы кажаце, што гэты стагнацыйны ўрад ніякім колам у рынак не загнаць... А я кажу, што такі кол ёсьць. Такі кол — гэта менавіта тыя пагадненьні з Расіяй, на якіх настойвае ўрад. Вось гэтым колам можна наш урад загнаць у рынак, а іншага я пакуль ня бачу”, — прамаўляў Шушкевіч да дэпутатаў ВС[14].

Разам з тым С.Шушкевіч нэгатыўна ставіўся да прапановаў актывізаваць супрацоўніцтва з Расіяй у вайсковай сфэры. Увесну 1993 г. ён выказаўся супраць далучэньня Беларусі да сыстэмы калектыўнай бясьпекі СНД, разглядаючы гэта як пагрозу сувэрэнітэту Беларусі. На думку Шушкевіча, вайсковы саюз не дапаможа беларускай эканоміцы, бо цэны на беларускую вайсковую прадукцыю будзе вызначаць Расія — галоўны пастаўнік камплектуючых беларускага ВПК. Таксама ён зьвяртаў увагу на магчымасьць уцягваньня Беларусі ў канфлікты за яе межамі[15]. Улетку 1993 г. С. Шушкевіч заявіў, што Беларусі патрэбны не вайсковы саюз з Расіяй, а праграма скарачэньня вайсковага бюджэту ў кірунку аптымізацыі сыстэмы ўзбраеньняў[16].

Шушкевіч скептычна ўспрыняў і ўрадавыя прапановы наконт стварэньня эканамічнага саюзу з Расіяй. У сакавіку 1993 г. ён выказаўся так: “...Што прадугледжвае новы тып эканамічнага саюзу? Давайце спынім лавіраваньне, адкінем усе славесныя шырмы і скажам нашаму народу прама: гэты новы тып можа быць толькі адным — эканамічным саюзам у межах канфэдэрацыі дзяржаваў, ці больш дакладна — канфэдэратыўнай дзяржавай. Калі гэта так, тады ня трэба гуляць у эканамічную і палітычную эквілібрыстыку. Няхай новую праграму прадыктуе новы цэнтар у Маскве. Калі большасьць Вярхоўнага Савету стаіць на такой пазыцыі, неабходна паставіць пытаньне аб стварэньні канфэдэратыўнай дзяржавы з Расіяй і іншымі былымі рэспублікамі на парадак дня сэсіі”[17]. У верасьні 1993 г. тагачасны кіраўнік беларускай дзяржавы выказаўся яшчэ разчэй: “Урад рэспублікі... не распачаў прагматычную палітыку адаптацыі да новых абставінаў, а ўсё наіўна спадзяваўся на вяртаньне ў мінулае: “будзе Саюз — і ўсё вернецца”, “будзе калектыўная бясьпека — стане лепш”, “будзе рублёвая зона — і ўздыхнём з палёгкай”. Вынік — развал эканомікі, крах крэдытна-фінансавай сыстэмы, імклівы рост інфляцыі й катастрафічнае зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню насельніцтва Беларусі”[18].

У сьнежні 1993 г. С. Шушкевіч назваў контрапрадуктыўнай стаўку на тое, што беларуская прамысловасьць будзе выпрабляць благую прадукцыю, а беларускі ўрад зможа рэалізаваць яе на расійскім рынку, заваёўваючы яго палітычнымі сродкамі[19]. Крытычна ацэньваў сьпікер ВС і пляны стварэньня адзінай рублёвай зоны. “...Які сэнс Расіі перадаваць свае наяўныя рублі Беларусі, а не шахцёрам Варкуты — расіянам, якія па чатыры месяцы не атрымлівалі зарплаты? Савет Міністраў Беларусі, верагодна, жадае, каб жорсткую фінансавую палітыку праводзіў нехта іншы, а ён будзе тым часам ствараць сябе імідж казачна





мяккага ўраду, які клапоціцца аб дабрабыце народу”, — заяўляў ён[20].

У лютым 1994 г. праўрадавая бальшыня дэпутатаў ВС скінула С. Шушкевіча з пасады кіраўніка парлямэнту. В. Кебіч, па сутнасьці, застаўся адзін на вяршыні ўлады і пайшоў на першыя прэзыдэнцкія выбары з праграмай, у аснове якой ляжаў курс на паглыбленьне супрацоўніцтва з Расіяй. У красавіку 1994 г. у інтэрвію газэце “Правда” ён заявіў, што без супрацоўніцтва з Расіяй “Беларусь ня мае будучыні”. “...Рэч ня толькі ў сваяцтве па крыві, адвечным адзінстве з расійскім народам, — падкрэсьліваў Кебіч. — Мы адзіныя эканамічна. Амаль усе энэргарэсурсы, сыравіна, асноўная частка камлектуючых ідзе з Расіі, а дзьве траціны нашай прадукцыі паступаюць туды. Разбурэньне Саюзу, разрыў гаспадарчых сувязяў — трагедыя, катастрафічныя наступствы якой перажываюць усе рэспублікі, абярнулася для Беларусі эканамічным Чарнобылем. І выратаваньне — толькі ў інтэграцыі. Аб’яднаньне грашовых сыстэмаў, за якое... я быў вымушаны “ваяваць”, — толькі крок да поўнага эканамічнага саюзу з Расіяй. Гэта, калі хочаце, адзіны спосаб захаваць наш сувэрэнітэт”[21]. Ён уважаў, што прыклад Беларусі зацікавіць і іншыя краіны СНД і, такім чынам, паскорыць аб’яднальны працэс у рамках усёй Садружнасьці[22].

Аднак прэзыдэнцкія амбіцыі В. Кебіча ня спраўдзіліся. На выбарах улетку 1994 г. перамогу атрымаў А. Лукашэнка, які таксама сымпатызаваў ідэі збліжэньня славянскіх народаў. У інтэрвію “Народнай газеце” ў чэрвені 1994 г. ён казаў: “Я за сувэрэнітэт роднай Беларусі, але без граніц і мытняў, з добрымі суседзямі, і перш за ўсё з Украінай і Расіяй”[23].

Адразу ж пасьля свайго абраньня новы кіраўнік Беларусі заявіў: “Уся вонкавапалітычная дзейнасьць прэзыдэнта будзе абумоўлена эканамічнымі інтарэсамі краіны”[24]. Галоўным прыярытэтам вонкавай палітыкі ён лічыў аднаўленьне эканамічных сувязяў з Расіяй і іншымі дзяржавамі СНД. “Паколькі больш за 70% прадукцыі, якая выпрабляецца ў Беларусі, зарыентавана на збыт у Расію, трэба імкнуцца ня толькі захаваць усходні рынак, але і пашырыць яго. Тады ў нас будуць сродкі на аплату расійскай нафты і газу. Прадэклараваўшы намер ствараць беларуска-расійскія сумесныя прадпрыемствы, транснацыянальныя карпарацыі, ...стары ўрад аказаўся няздольны рэалізаваць гэтую вельмі разумную ініцыятыву. Новы ж урад будзе надаваць гэтаму вельмі значную ўвагу і дакажа на практыцы сваю дзеяздольнасьць”, — заявіў ён у ліпені 1994 г.[25]. Тады ж А. Лукашэнка дадаў, што будзе спрыяць захаваньню Беларусяй бязьядравага статусу і нэўтралітэту, але ня будзе патрабаваць вываду расійскіх войск зь беларускай тэрыторыі[26].

Неўзабаве А. Лукашэнка адмовіўся ад стварэньня адзінай рублёвай зоны з Расіяй, спаслаўшыся на тое, што гэты крок неспрыяльна адаб’ецца на беларускай эканоміцы. “Калі мы хочам адразу ж разбурыць беларускую эканоміку, нам трэба ўступіць у грашовы саюз. У іх інфляцыя стварае 5% (у месяц), а ў нас — 40. Як толькі мы аб’яднаем грашовыя сыстэмы, мы ня зможам выжыць. Нам трэба зьнізіць інфляцыю і хаця б трохі наблізіцца да расійскіх эканамічных рэ-

формаў. Калі мы зробім гэта, пытаньне аб’яднаньня грашовых сыстэмаў стане рэальнасьцю”, — казаў А. Лукашэнка ў жніўні 1994 г.[27].

Падчас першага рабочага візыту ў Маскву ў жніўні 1994 г. А. Лукашэнка паставіў перад расійскім кіраўніцтвам пытаньні аб кампэнсацыі за ядравыя кампанэнты зброі, якая ў пачатку 1990-х гадоў была выведзеная зь Беларусі ў Расію, аб пагашэньні запазычанасьці перад Расіяй шляхам акцыянаваньня беларускіх прадпрыемстваў і ўлучэньня іх у міжнацыянальныя фінансава-прамысловыя групы, аб узаемных разьліках паміж дзьвюма дзяржавамі пры захаваньні іх уласных валютаў, прапанаваў перагледзець пытаньні аб замежнай уласнасьці былога СССР (у 1992 г. Беларусь адмовілася ад часткі замежнай уласнасьці СССР на карысьць Расіі пры ўмове, што Расія будзе пагашаць запазычанасьць Беларусі, якая ўтварылася ў часы існаваньня СССР) і аб знаходжаньні расійскіх войскаў і стратэгічных аб’ектаў на тэрыторыі Беларусі[28].

У кастрычніку 1994 г. Прэзыдэнт Рэспублікі Беларусі заявіў, што яго краіна не павінна мець з Расіяй “адносіны такога ж узроўню, як у яе будуць з краінамі далёкага замежжа”. “Мы не здаём ніякага тут сувэрэнітэту, а хочам цывілізавана будаваць свае адносіны з тымі, без каго мы проста жыць ня можам”, — падкрэсьліў ён[29]. У гэты ж час Лукашэнка заявіў, што ён падтрымлівае ідэю стварэньня мытнага саюзу на прасторы СНД, але, калі ідэя ня будзе падтрыманая кіраўнікамі іншых дзяржаваў Садружнасьці, Беларусь можа ўкласьці адпаведнае пагадненьне толькі з Расіяй. Таксама ён крытычнае паставіўся да прапановы прэзыдэнта Казахстану Нурсултана Назарбаева аб стварэньні Эўразійскага саюзу, падкрэсьліўшы, што ён аддае перавагу стварэньню эфэктыўных структураў кіраваньня СНД[30]. Тым самым А. Лукашэнка даў зразумець, што яго больш цікавіць разьвіцьцё сувязяў з Расіяй, чымся інтэграцыя ў межах Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў.

У сакавіку 1995 г. А. Лукашэнка, выступаючы з праграмнай прамовай перад дэпутатамі ВС, вылучыў разьвіцьцё прыязных адносінаў з Расіяй у якасьці аднаго з галоўных прыярытэтаў вонкавай палітыкі Беларусі, падкрэсьліўшы, што ўмацаваньне сувязяў з Расіяй стане для Беларусі асноватворным фактарам выйсьця з крызысу і паслужыць для стабілізацыі шмат якіх аспэктаў яе ўнутранага жыцьця. Беларускі прэзыдэнт сьцьвярджаў, што ўсе пагадненьні, якія Беларусь падпісала з Расіяй у пачатку 1995 г., ёсьць пагадненьнямі паміж сувэрэннымі дзяржавамі, суб’ектамі міжнароднага права. Таксама ён зьвярнуў увагу на тое, што супрацоўніцтва з Расіяй прынясе Беларусі карысьць, бо Расія пагадзілася пастаўляць у Беларусь нафту і прыродны газ па цэнах, ніжэйшых, чымся для іншых краінаў СНД[31].

Заклікаючы дэпутатаў ратыфікаваць расійска-беларускую Дамову аб дружбе, добрасуседзтве і супрацоўніцтве, якая была падпісаная ў Менску ў лютым 1995 г., А. Лукашэнка гаварыў: “Умацаваньне нашых сувязяў з Расіяй па шляху ўзаемнага эканамічнага пранікненьня для Беларусі ёсьць асноватворным фактарам выхаду з крызысу і стабілізацыі шмат якіх аспэктаў унутранага жыцьця





рэспублікі. Я маю на ўвазе палітычна-эканамічны, сацыяльны, гістарычна-маральны аспэкт, беспасярэдне зьвязаны зь сьвяткаваньнем 50-годзьдзя Вялікай Перамогі і аднаўленьня гістарычнай супольнасьці славянскіх народаў. Адмаўляць глыбокае сэнсавае значэньне гэтай дамовы азначае непавагу да той гістарычнай мінуўчыны і цяперашчыны, чым жылі, жывуць і будуць жыць братнія беларускі і расійскі народы”[32].

У сакавіку 1996 г. беларускі прэзыдэнт адкрыта ўзяў курс на зьбліжэньне з Расіяй. У выступе перад дэпутатамі ВС ён заявіў, што пад беларуска-расійскія адносіны неабходна пакласьці добры палітычна-праўны фундамэнт, спаслаўшыся на тое, што “ўсё трымаецца на ўзаемапаразуменьні двух прэзыдэнтаў”. Ён зноў падкрэсьліў, што зьбліжэньне з Расіяй не прывядзе да страты Беларусяй сваёй незалежнасьці. “Ува ўсіх органах міждзяржаўнага супрацоўніцтва Беларусь і Расія будуць мець вылучна роўныя правы. Ніводнае з пытаньняў, што закранае інтарэсы Беларусі, ня можа разглядацца безь яе ўдзелу з правам вырашальнага голасу”, — прамаўляў Лукашэнка[33]. “Я хачу, каб вы зразумелі, што мы не ствараем новую дзяржаву, а фармуем саюз дзьвюх дзяржаваў”, — запэўніваў А. Лукашэнка дэпутатаў, зьвярнуўшы ўвагу на тое, што Беларусь захоўвае сваю заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўладу, дзяржаўны бюджэт і фінансава-крэдытную сыстэму, усе пастановы Рады Саюзу будуць прымацца шляхам кансэнсусу, а аснову дзейнасьці Саюзу закладуць сумесныя праекты і праграмы[34]. Ён сьцьвярджаў, што грамадзяне дзьвюх дзяржаваў будуць мець зусім роўныя правы ў пытаньнях аховы здароўя, адукацыі, працаўладкаваньня, набыцьця маёмасьці, будаўніцтва жытла і інш. Лукашэнка выступіў у падтрымку стварэньня Міжпарлямэнцкага кангрэсу, заўважыўшы, што распрацаваныя ім мадэльныя акты будуць выкарыстоўвацца пры рэфармаваньні беларускай праўнай сыстэмы, якая будзе рэгуляваць эканамічныя адносіны.

У пачатку красавіка 1996 г. была апублікаваная адозва А. Лукашэнкі да беларускага народу, у якой гаварылася, што новая дамова з Расіяй павінна “выправіць гістарычную памылку 1991 году, якая разьяднала беларусаў і расійцаў”. Таксама у адозьве гаварылася, што Супольнасьць Беларусі й Расіі “стане якасна новай формай міждзяржаўнага ўзаемадзеяньня. У ёй ня будзе той ненатуральнай цэнтралізацыі, ад якой пакутаваў Савецкі Саюз. Але ў ёй ня будзе той слабасьці, неэфэктыўнасьці, з-за якой практычна няма аддачы ад Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў”[35].

Аднак увосень 1996 г. беларускі прэзыдэнт выказаў незадаволенасьць характарам адносінаў паміж Расіяй і Беларусяй. У выступе на І Усебеларускім народным сходзе ў кастрычніку 1996 г. ён заявіў: “Дружба з Расіяй — гэта гарантыя сувэрэннага існаваньня нашай дзяржавы”[36]. 13 лістапада 1996 г. А. Лукашэнка выступіў перад дэпутатамі расійскай Дзяржаўнай думы і заявіў, што Беларусь і Расія павінны працягваць курс на зьбліжэньне, бо Супольнасьць “ня стала самаразьвіваным арганізмам”. А. Лукашэнка зьняпраўдзіў цьверджаньні аб калясальнай запазычанасьці Беларусі за пастаўкі расійскіх нафты і газу, заўважыўшы,

што запазычанасьць складае трохі больш за 100 млн. даляраў ЗША. Асаблівы ціск беларускі прэзыдэнт зрабіў на тое, што ў Беларусі "расійскамоўнае насельніцтва адчувае сябе як у былым Савецкім Саюзе"[37].

Больш разгорнута сваё бачаньне саюзу з Расіяй Лукашэнка выклаў у выступе на 3-й сэсіі Парлямэнцкага сходу Супольнасьці Расіі й Беларусі ў сакавіку 1997 г. Ён заклікаў расійцаў адмовіцца ад стварэньня прадпрыемстваў-дублёраў, узгадняць дзеяньні экспартэраў на рынках трэціх краінаў, сумесна фінансаваць навукова-тэхнічныя праграмы, фармаваць адзіную замову на прадукцыю ВПК, сфармаваць адзіны аграрны рынак. Беларускі лідэр заклікаў стварыць адзінае апэратыўнае поле дзейнасці спэцслужбаў і выступіў у падтрымку адзінай мытнай прасторы. Таксама А. Лукашэнка выказаўся на карысьць стварэньня трохузроўневай сыстэмы кіраваньня Супольнасьцю. Згодна зь ім, у Супольнасьці трэба стварыць наднацыянальныя органы, якім неабходна перадаць кіраваньне мытнай тэрыторыяй і межамі міждзяржаўнага аб'яднаньня, адзінай энэргасыстэмай, адзінай транспартнай сыстэмай, адзінай сыстэмай сувязі, пытаньні падаткаабкладаньня, кіраваньне Плацежным саюзам, правядзеньне эканамічнай палітыкі ў адносінах да тавараў і паслуг, якія перамяшчаюцца праз мытныя межы Супольнасьці, вызначэньне галоўных арыенціраў эканамічнай палітыкі дзяржаваў-удзельніцаў, ажыцьцяўленьне кантролю за становішчам бюджэтаў і сумай дзяржаўнага доўгу, валютным і фінансавым станам дзяржаваў-удзельніцаў, правядзеньне супольнай гандлёвай палітыкі, асабліва пры вызначэньні тарыфных ставак, укладаньня тарыфных і гандлёвых пагадненьняў, лібэралізацыі экспартнай палітыкі. Таксама Лукашэнка выказаўся за пашырэньне паўнамоцтваў Парлямэнцкага сходу Супольнасьці, у прыватнасьці за наданьне яму права зацьвярджаць бюджэт Супольнасьці, за стварэньне Суду і Банку Супольнасьці, а таксама за ўвядзеньне грамадзянства Супольнасьці. Адпаведныя палажэньні, на яго думку, трэба зафіксаваць у Статуце Супольнасьці. Лукашэнка ўважаў, што Супольнасьць павінна атрымаць статус суб'екта міжнароднага права, а Старшыня Супольнасьці павінен мець права на вядзеньне перамоваў і ўкладаньне міжнародных дамоваў ад імя Супольнасьці са згоды яе Найвышэйшай рады[38].

Аднак магчымасьць уваходжаньня Беларусі ў склад Расіі ў якасьці яе асобнай губэрні беларускі кіраўнік станаўко адкідаў. У выступе на сэсіі Парлямэнцкага сходу Супольнасьці ён заявіў, што саюз з Расіяй павінен быць раўнапраўны[39]. Празь некаторы час Лукашэнка на сустрэчы з дэлегатамі III Кангрэсу народаў СССР падкрэсьліў: "Беларускі народ ніколі не падтрымае тых, хто бачыць Беларусь у якасьці расійскай губэрні"[40]. У красавіку 1997 г. у выступе перад дэпутатамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі А. Лукашэнка прамаўляў: "...Узаемнае збліжэньне Расіі й Беларусі зусім не азначае зьліцьця нашых краінаў. Сувэрэнітэт і незалежнасьць Беларусі будуць захаваныя. Да таго ж, ідучы на глыбокую інтэграцыю, мы, безумоўна, павінны ўлічваць і асаблівасьці нашых эканомік, структуры вытворчасьці"[41].

Разам з тым 10 чэрвеня 1997 г. у выступе на сэсіі Рады Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі Лукашэнка канстатаваў, што яго насьцярожваюць паводзіны Расіі, і выказаў занепакоенасьць тым, што падпісаныя дакумэнты дагэтуль не рэалізаваныя ў поўным аб'ёме[42].

У сьнежні 1997 г. А. Лукашэнка ў інтэрвію агенцыі "Интерфакс" заявіў, што курс на інтэграцыю з Расіяй застаецца асновай вонкавае палітыкі Беларусі: "Такую вонкавую палітыку мы проста выпакутавалі. Мы не выдумлялі яе ў кабінэтах, а ішлі да яе, я б сказаў, выкрышталізоўвалі, зыходзячы з традыцыяў і мэнтальнасьці беларускага народу, яго спадзяваньняў". Пры гэтым Лукашэнка дадаў, што працэс інтэграцыі стрымлівае расійскі бок: "Мы... гатовыя на такую ступень інтэграцыі, на якую гатова Расія. Але ўсё павінна быць узаемавыгадным. Непрымальная сытуацыя, калі б нас паставілі ў няроўнае становішча з прычыны несувымернасьці колькасьці насельніцтва і маштабаў тэрыторыяў дзьвюх краінаў". Беларускі прэзыдэнт зазначыў, што асабіста ён зусім не імкнецца стаць саюзным кіраўніком: "Я прэзыдэнт эўрапейскай, цывілізаванай, даволі буйной дзяржавы. У мяне ёсьць улада, шырокія магчымасьці праявіць сябе на гэтай пасадзе. Але існуюць супольныя інтарэсы Беларусі й Расіі. І я гатовы ў імя гэтых інтарэсаў рабіць усё: узяць на сябе большы аб'ём работы, а калі буду перашкодай, то пайсьці назусім"[43].

Новы ўсплёск інтэграцыйных ініцыятываў адбыўся ў сьнежні 1998 г. 17—18 сьнежня 1998 г. беларускі прэзыдэнт адведаў Маскву, дзе запатрабаваў наданьня беларускім гаспадарчым суб'ектам роўных магчымасьцяў з расійскімі і выказаўся на карысьць увядзеньня расійскага рубля ў якасьці адзінай валюты для дзьвюх дзяржаваў[44]. Лукашэнкаў патас быў крытычны: "Альбо мы займаемся балбатнёй аб нейкім аморфным саюзе, альбо мы сапраўды робім капітальныя крокі ў кірунку яднаньня нашых народаў, якія прынясуць калясальны посьпех для дзьвюх дзяржаваў і народаў"[45]. 25 сьнежня 1998 г. у Маскве былі падпісаныя Дэклярацыя аб далейшым яднаньні Беларусі й Расіі, Дамова паміж Рэспублікай Беларусяй і Расійскай Фэдэрацыяй аб роўных правах грамадзянаў, Пагадненьне паміж Рэспублікай Беларусяй і Расійскай Фэдэрацыяй аб стварэньні роўных умоваў суб'ектам гаспадараньня.

Не прайшло і паўгоду, як 2 ліпеня 1999 г. на паседжаньні Парлямэнцкага сходу Саюзу Беларусі й Расіі А. Лукашэнка абвінаваціў расійскі ўрад у сабатажы пастановаў, прынятых у сьнежні 1998 г. Расія ў аднабаковым парадку аднавіла мяжу зь Беларусяй, заявіў Лукашэнка, спасылаючыся на разыходжаньні ў памерах ставак увазных мытных збораў больш чым па 150 пазыцыях. Ён падкрэсьліў існаваньне істотных адрозьненьняў ува ўзроўнях цэнаў і тарыфаў для беларускіх і расійскіх суб'ектаў гаспадараньня на газ, электраэнэргію, паслугі транспарту і сувязі, адсутнасць узгодненай грашова-крэдытнай палітыкі. Лукашэнка скардзіўся: "Мы... зрабілі капітальную памылку, прадэкляраваўшы шматвэктарнасьць вонкавай палітыкі, але на самай справе зрабіўшы дзікі крэн на ўсход. І ў выніку надта і надта шмат можам страціць у пэрспэктыве"[46].

Напалохаўшы расійцаў пераарыентацыяй вонкавай палітыкі Рэспублікі Бе-

ларусі, А. Лукашэнка выступіў з новымі інтэграцыйнымі прапановамі. У прыватнасьці, ён выказаўся за ўвядзеньне пасадаў прэзыдэнта і віцэ-прэзыдэнта Саюзу Беларусі і Расіі. У інтэрвію нямецкай газэце “Die Woche” 9 ліпеня 1999 г. беларускі кіраўнік казаў, што пасады прэзыдэнта і віцэ-прэзыдэнта маглі б заняць, адпаведна, Б. Ельцын і А. Лукашэнка.

27 кастрычніка 1999 г. Лукашэнка зноў выступіў у расійскай Дзяржаўнай думе. Яго прамова стракацела фразамі “неабходнасьць дынамізму і глыбіні працэсу інтэграцыі Беларусі й Расіі ня толькі даўно насьпела, але і перасьпела”, “народы могуць страціць веру ў саму ідэю Саюзнай дзяржавы і магчымасьць яе рэалізацыі”[47].

8 сьнежня 1999 г. Б. Ельцын і А. Лукашэнка падпісалі ў Крамлі дакумэнты аб стварэньні Саюзнай дзяржавы. Адразу па падпісаньні беларускі прэзідэнт выказаў незадавальненне імі, назваўшы іх “кампрамісным варыянтам”: “Нічога новага створана не было, мы толькі адшліфавалі прынятыя раней дакумэнты аб інтэграцыі дзьвюх краінаў”[48].

Задоўга да гэтага, у сакавіку 1997 г., Лукашэнка прапанаваў стварыць вось “Менск—Масква—Пэкін” у адказ на пашырэньне НАТА на ўсход. У далейшым ён разьвіў гэтую думку, разглядаючы Саюз Беларусі й Расіі як частку сыстэмы шматпалярнага сьвету, якая павінна супрацьстаяць дзяржавам Захаду. У 1999 г. у інтэрвію адыёзнаму часопісу “Беларуская думка” А. Лукашэнка прызнаўся: “Аднапалярны свет прынцыпова няўстойлівы, таму ў інтарэсах усяго чалавецтва неабходна аднавіць пэўную раўнавагу на плянэце, улічваючы пры гэтым патрэбы ўсіх, а ня толькі заходніх дзяржаваў. Як мне здаецца, гэта магчыма тады, калі сьвет будзе шматпалярны. Адным з полюсаў павінен стаць Саюз Беларусі й Расіі, да якога зь цягам часу далучацца й іншыя дзяржавы”[49]. Падобным парадкам у выступе перад дэпутатамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі 7 красавіка 1999 г. Лукашэнка цьвердзіў, што Саюз Беларусі й Расіі перашкаджае Захаду “па-свойму цывілізаваць усю плянэту”[50]. У лютым 1999 г. у інтэрвію журналістам іранскай тэлерадыёкампаніі Лукашэнка заўважыў, што да Саюзу маглі б далучыцца Кітай, Індыя, Іран і іншыя дзяржавы сьвету, падкрэсьліўшы, што такое аб’яднаньне магло б стаць моцнай процівагай ЗША і НАТА[51].

Улетку 1999 г. А.Лукашэнка цяжка перажыў капітуляцыю С. Мілошавіча пад ціскам НАТА. “На Балканах прайграў не Мілошавіч, а мы ўсе прайгралі. Мы перажылі жорсткую паразу і хутка ў гэтым пераканаемся”, — заявіў ён 10 чэрвеня 1999 г. Плян мірнага ўрэгуляваньня на Балканах Лукашэнка назваў “паразай славянскіх народаў”[52]. У ліпені 1999 г. ён абвінаваціў у тым, што адбылося на Балканах, расійскі бок: “Вызначцеся, нарэшце! Вызначцеся, чаго хоча Расія. І калі вы празь якія-небудзь праблемы... хочаце найперш нармалізаваць адносіны з заакіянскімі дзяржавамі, скажыце нам”, — заклікаў ён дэпутатаў расійскай Дзяржаўнай думы ў выступе на Парлямэнцкім сходзе Саюзу Беларусі й Расіі 2 ліпеня 1999 г. — Але я ўважаю, перш як Расіі вырашаць глябальныя пытаньні за тысячы кілямэтраў ад яе межаў (гэта таксама трэба рабіць, як вялікай дзяржаве),





трэба навесьці парадак каля ўласнага парогу. Вы паглядзіце, што дзеецца ў Грузіі, Азэрбайджане, Туркмэністане, Узбэкістане, Украіне, Прыбалтыцы. Фактычна стварылася кола дзяржаваў, якія на Расію не нэгатыўна глядзяць, але насьцярожана ставяцца да палітыкі Расійскай Фэдэрацыі. Я гэта бачу на самітах кіраўнікоў СНД. Дык няўжо гэта праблема сёньня неактуальная? Вы ж, вырашаючы пытаньне за акіянам, можаце тут страціць галоўных сваіх саюзьнікаў, а таксама страціць і рынак, якім вы заўсёды кіравалі, нават знаходзячыся ў Савецкім Саюзе. Нашто, уклаўшы столькі працы, расійскаму народу страчваць гэтую прастору? Нашто? Мы кажам сёньня аб Украіне. У Расіі я ўсё часьцей чую, асабліва ў сродках масавай інфармацыі: Украіна ня хоча далучацца да Саюзу Беларусі й Расіі. Шаноўныя мае, прачніцеся! Да чаго далучацца? /.../ Мы ж не паказалі прыклад ні Ўкраіне, ні нават Югаславіі, скажу шчыра, якая трапіла ў цяжкое становішча, якая гатовая была рабіць крокі насустрач нам. Мы ж проста па-людзку ім не адказалі, як мы будзем абыходзіцца зь імі, дэкляруючы ў сваёй дамове тое, што ў нас Саюз адкрыты, уступайце хто хоча. А тыя, хто ў Дзяржаўнай думе выступае сёньня за пашырэньне Саюзу, за нармальныя адносіны з краінамі Блізкага Ўсходу, мусульманскімі дзяржавамі Іранам, Іракам, проста абструкцыі ў вас паддаюцца. Але ж яны кажуць слушныя рэчы! Мы хутка страцім і гэтыя дзяржавы, у якіх нас яшчэ чакаюць. /.../ ...Мы сёньня губляем час і хутка атрымаем вельмі нэгатыўныя і смутныя вынікі гэтай палітыкі”[53].

Лукашэнку ў гэтай справе падтрымаў тагачасны міністар замежных справаў Рэспублікі Беларусі У. Латыпаў, які ўвесну 1999 г. заявіў, што Беларусі валей яднацца з Расіяй разам з Украінай: “...Гісторыя трох нашых народаў, нашы палітычныя і эканамічныя інтарэсы, інтарэсы ў сфэры бясьпекі, наша культурнае падабенства, вайсковыя чыны (ратные подвиги), роднасныя сувязі даюць поўнае права гаварыць аб беларусах, расійцах і ўкраінцах як акурат аб братніх народах. /.../ На сёньняшні дзень заданьне перад трыма братнімі славянскімі народамі стаіць наступнае: асэнсаваць глыбінную ўзаемасувязь сваіх адвечных інтарэсаў; асэнсаваць тыя новыя інтарэсы і магчымасьці, якія адкрыліся перад намі ў сувязі з глябальнымі зрухамі на сусьветнай арэне; стварыць новую сыстэму раўнапраўнага супрацоўніцтва, якая, засяродзіўшы дадатны гістарычны, палітычны і эканамічны досьвед, адначасова дапамагла б кожнаму народу рэалізаваць свае сувэрэнныя інтарэсы”[54].

Ад Расіі вышэйшыя службовыя асобы Беларусі патрабавалі падтрымкі пры вядзеньні дыялёгу з Захадам. Так, пасол Рэспублікі Беларусі ў Расійскай Фэдэрацыі Ўладзімер Грыгор’еў у студзені 1998 г. гаварыў: “Вонкавая палітыка Расіі — гэта яе ўнутраная справа. Але, зразумела, мы ня можам ставіцца да яе абыякава. ...Калі мы саюзьнікі, дык трэба актыўней падтрымліваць адзін аднаго. Вось падчас узброенага канфлікту ў Чачні мы ніколі не рабілі ніякіх асуджальных заяваў, хаця сам факт вайны нам і не спадабаўся. Мы б хацелі, каб падтрымка была аказана і нам з боку Расіі, найперш у пытаньні аб уваходжаньні Беларусі ў эўрапейскія й іншыя міжнародныя структуры. Той факт, што мы не прадстаўле-

ныя ў шэрагу міжнародных арганізацыяў, шкодны і для сусьветнай супольнасьці, і для Расіі”[55].

Адстаўка Б. Ельцына з пасады Прэзыдэнта Расійскай Фэдэрацыі й прыход да ўлады Ў. Пуціна ў сьнежні 1999 г. былі неспадзяванкай для А. Лукашэнкі. У 2000 г. у яго выступах усё больш і больш праступала незадаволенасьць дзейнасьцю Саюзнай дзяржавы. Так, у траўні 2000 г. на чарговай сэсіі Парлямэнцкага сходу Саюзу Беларусі й Расіі беларускі прэзыдэнт заявіў, што рэальная карысьць ад беларуска-расійскай інтэграцыі “амаль што нябачная”, бо Беларусь і Расія не забясьпечылі ў поўным аб’ёме роўных ўмоў суб’ектам гаспадараньня, не завяршылі выраўноўваньня цэнаў і тарыфаў на прадукцыю і паслугі ў галінах транспарту, электраэнэргетыкі і газавай прамысловасьці, маюць шэраг складаных праблемаў у сфэры мытнага рэгуляваньня, не ўрэгулявалі праблемы запазычанасьці Беларусі перад расійскімі пастаўнікамі энэрганосьбітаў[56]. На думку беларускага прэзыдэнта, ідэя інтэграцыі пачынае страчваць папулярнасьць у масах, таму трэба пашырыць паўнамоцтвы саюзнага парлямэнту шляхам перадачы яму кантрольных функцыяў. Таксама А. Лукашэнка прапанаваў дэпутатам папрацаваць над праектам Канстытуцыі Саюзнай дзяржавы.

У красавіку 2000 г. у выступе перад Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусі А. Лукашэнка заявіў аб стварэньні адзінай расійска-беларускай вайсковай групоўкі колькасьцю да 300 тыс. чалавек. Пазьней, на 15-й сэсіі Парлямэнцкага сходу Саюзу Беларусі й Расіі, ён скарэктаваў сваю пазыцыю: паводле ягоных словаў, адпаведная групоўка будзе створана толькі ў выпадку ўзьнікненьня канфліктнай сытуацыі на заходніх межах Саюзнае дзяржавы. У чэрвені 2000 г. на сустрэчы з У. Пуціным А. Лукашэнка казаў, што Беларусь гатова “прыняць” расійскі рубель[57]. Аднак у сьнежні 2000 г. на сустрэчы кіраўнікоў дзяржаваў СНД у Менску ён заявіў, што з разьвязаньнем пытаньня аб адзіным эмісійным цэнтры сьпяшацца ня трэба: “Абодва бакі павінны адмовіцца ад нейкай часткі сувэрэнітэту... Але ня так, што мы друкавальны варштат паставім у Крамлі і тым самым сувэрэнітэт свой адвязём у Крэмль... Так ня будзе”[58].

Супярэчлівымі былі заявы Лукашэнкі і што да выбараў саюзнага парлямэнту. У чэрвені 2000 г. ён гаварыў, што, па-першае, трэба прыняць канстытуцыйны акт, на падставе якога будуць праводзіцца выбары, а па-другое, неабходна вызначыць кола праблемаў, якія будуць вырашаць “саюзныя” парлямэнтары. Пры гэтым ён падкрэсьліў, што выбары ў саюзны парлямэнт трэба праводзіць адначасова з выбарамі беларускіх і расійскіх парлямэнтароў. На Лукашэнкаву думку, выбары ў саюзны парлямэнт хутчэй за ўсё адбудуцца ў 2001 г., бо ўвосень 2000 г. саюзны парлямэнт сфармаваны ня будзе[59].

На прыёме для кіраўнікоў дыпляматычных місіяў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусі, і прадстаўнікоў шэрагу міжнародных арганізацыяў 13 студзеня 2001 г. А. Лукашэнка падкрэсьліў, што ён маніцца працягваць курс на інтэграцыю з “братняй Расіяй”[60]. Гэтая ж думка была выказаная ім і на нарадзе кіраўнікоў дыпляматычных місіяў Рэспублікі Беларусі 2 сакавіка 2001 г.[61].





Тэма інтэграцыі з Расіяй актыўна выкарыстоўвалася А. Лукашэнкам падчас прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі. У маі 2001 г. на II Усебеларускім сходзе Лукашэнка прамаўляў: “Нягледзячы на нападкі, мы ўсе гэтыя гады цьвёрда крочылі па абраным шляху з адной-аднюсенькай прычыны: саюз з Расіяй — гэта жаданьне пераважнае бальшыні беларусаў. Ён адпавядае карэнным інтарэсам усяго беларускага народу.

Саюз з Расіяй — гэта цяпло і сьвятло ў беларускіх кватэрах.

Саюз з Расіяй — гэта свабодны доступ на вялізны расійскі рынак без усялякіх бар’ераў і абмежаваньняў.

Саюз з Расіяй — гэта найбуйнейшыя сумесныя праекты. Расія прадастаўляе Беларусі нафтавыя радовішчы. Пракладка праз нашу тэрыторыю другой ніткі газаправоду з Расіі ў Эўропу (а пытаньне гэтае ўжо прынцыпова вырашана) дасьць рэспубліцы ў выглядзе платы за транзыт амаль мільярд даляраў.

І, нарэшце, раўнапраўны саюз з Расіяй — гэта рэальны сувэрэнітэт беларускай дзяржавы”[62].

Адкрыта ксэнафобскую рыторыку Лукашэнка ўжыў у ліпені 2001 г. на ўрачыстым сходзе, прысьвечаным Дню незалежнасьці Рэспублікі Беларусі: “Ува ўмовах пашырэньня НАТА на ўсход, узрослай вайскова-палітычнай прысутнасьці ЗША ў беспасярэдняй блізіні зь межамі Беларусі, а таксама наяўнасьці прэцэдэнтаў вядзеньня заходнімі дзяржавамі агрэсіўных ваенных дзеяньняў супраць сувэрэнных дзяржаваў саюз з Расіяй ёсьць жыцьцёва неабходны. Ствараецца адзіная абаронная прастора, рэгіянальная сыстэма калектыўнай бясьпекі. Гэта прыярытэтныя стратэгічныя кірункі беларуска-расійскіх сувязяў. Дадатковая гарантыя нашай незалежнасьці і абароненасьці ад сучасных пагроз, адстойваньне нацыянальных інтарэсаў Беларусі й Расіі на міжнароднай арэне, больш дынамічнае разьвіцьцё палітычных, эканамічных і іншых адносін з трэцімі краінамі”[63].

У чэрвені 2001 г. у выступе перад дэпутатамі Парлямэнцкага сходу Саюзу Беларусі й Расіі А. Лукашэнка выказаў меркаваньне, што Расія і Беларусь павінны актыўней узгадняць свае пазыцыі ў адносінах з замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі і настойлівей праводзіць курс на рэалізацыю Дамовы аб стварэньні Саюзнай дзяржавы, праграмы захадаў што да рэалізацыі гэтай дамовы, распрацаваць канстытуцыйны акт, які б прадугледжваў стварэньне наднацыянальных органаў, зьвярнуцца да Ўкраіны і Малдовы з прапановай далучэньня іх да Саюзу Беларусі й Расіі[64].

Пасьля перамогі на выбарах у верасьні 2001 г. А. Лукашэнка стаў разчэй выказвацца наконт саюзнай Расіі. 14 сьнежня 2001 г. на сустрэчы са сваімі даверчымі асобамі Лукашэнка падкрэсьліў: “Мы зробім усё, што абяцалі ў рамках Саюзу Беларусі й Расіі, і пойдзем так далёка ў гэтым саюзе, наколькі сёньня здольная пайсьці Расійская Фэдэрацыя... Гэты працэс ад нас зусім не залежыць. Калі Расія гатова пайсьці ў рамках міжнароднага права, на прынцыпах міжнародных, якія вызначаныя ўжо даўно, на прынцыпах раўнапраўнасьці, калі

Расія гатовая ісьці да Саюзнай дзяржавы з адзінымі органамі кіраваньня, зь перадачай значных функцыяў гэтым органам кіраваньня — мы гатовыя”[65].

Дзейнасьць пуцінскай адміністрацыі выклікала незадаволенасць беларускага прэзыдэнта, асабліва ўзяты расійцамі ўвосень 2001 г. курс на збліжэньне з Захадам. У пачатку 2002 г. А. Лукашэнка на нарадзе ў пытаньнях Саюзнае дзяржавы заявіў: “Мы ня можам ува ўсім насьледаваць Расіі, якая прымае тое, што ёй карыснае. Павінна быць узгодненая палітыка дзьвюх саюзных дзяржаваў”[66]. У сакавіку 2002 г. на сэмінары кіраўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады А. Лукашэнка заявіў, што адносіны паміж Беларусяй і Расіяй “не паляпшаюцца, а пагаршаюцца”, патлумачыўшы гэта тым, што Беларусь і Расія ствараюць Саюзную дзяржаву, “узяўшы за арыенцір прывідныя мадэлі, якія навязвае Захад, а не свае інтарэсы”[67].

Сьледам за Лукашэнкам клясьціся ў сваёй адданасьці незалежнасьці Беларусі й неабходнасьці перагляду ранейшай палітыкі што да Саюзу Беларусі й Расіі пачалі іншыя афіцыйныя прадстаўнікі. Кіраўнік беларускага МЗС Міхаіл Хвастоў у кастрычніку 2001 г. канстатаваў: “Саюзную дзяржаву разам узводзяць дзьве самастойныя незалежныя дзяржавы — Беларусь і Расія. Сёньняшні этап станаўленьня Саюзнай дзяржавы адметны ўзважаным падыходам да гэтай справы. Напрыклад, няма дэклярацыяў аб нейкіх палітычных звышмэтах на вельмі далёкую пэрспэктыву. Беларусь і Расія адзіныя ў думцы, што цяпер на першы плян вылучаецца заданьне стварэньня трывалай эканамічнай плятформы Саюзнае дзяржавы, неабходнасьць наладзіць дзейсную працу яе органаў і ўстановаў”[68].

Яшчэ шчырэй у лютым 2002 г выказаў сваё стаўленьне да Саюзу старшыня Рады Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі Аляксандар Вайтовіч: “Трэба прызнаць, што спачатку лідэры дзьвюх краінаў імкнуліся дасягнуць свае палітычныя мэты. Гэты этап скончыўся і прынёс свае вынікі. Цяпер ідзе эканамічнае збліжэньне, і размовы аб стрымліваньні інтэграцыі я лічу недарэчнымі. Вырашаць эканамічныя праблемы значна цяжэй. На мой пагляд, Саюзная дзяржава Расіі й Беларусі — няўдалы назоў, які ўводзіць у зман грамадзкасьць. Ні Расія, ні Беларусь не жадаюць губляць свой сувэрэнітэт”[69].

Можна канстатаваць, што ў курс на супрацоўніцтва з Расіяй з часам будуць унесеныя пэўныя карэктывы. Дырэктар Інстытуту дзяржаўнага кіраваньня Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі С. Рашэтнікаў у сьнежні 2001 г. пісаў: “Незалежна ад пэрспэктываў інтэграцыі, нацыянальныя інтарэсы Беларусі асуджаны перасякацца з расійскімі інтарэсамі. Для Беларусі найлепшая абарона яе нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў — гэта супрацоўніцтва з усходнім суседам. Але, каб супрацоўніцтва было сапраўды ўзаемавыгадным, Беларусі неабходны эфэктыўны мэханізм абароны сваіх інтарэсаў. Існуе некалькі кірункаў стварэньня такога мэханізму.

1. Актывізацыя дзейнасьці на “заходнім” і “паўднёвым” кірунках у рамках “балянсуючай” дыпляматыі.





2. Стварэньне партнэрскіх кааліцыяў зь іншымі постсавецкімі дзяржавамі.

3. Выкарыстаньне выгадаў, якія ўзьнікаюць у выніку зьмяненьня палітычнай кан’юнктуры ўнутры Расіі, напрыклад, улік электаральнага фактару.

4. Пошук саюзьнікаў у самой Расіі, стварэньне беларускага лобі”[70].

Аднак выразную лінію паводзінаў што да супрацоўніцтва з Расіяй у новых умовах беларускае кіраўніцтва яшчэ ня выпрацавала.

---

1 Приоритеты внешней политики Республики Беларусь. Мн., 2001. С. 9.
2 Народная газета. 1995. 8 жніўня.
3 Народная газета. 1992. 7 кастрычніка.
4 Народная газета. 1992. 11 чэрвеня.
5 Народная газета. 1992. 23 ліпеня.
6 Рэспубліка. 1993. 19 сакавіка.
7 Советская Белоруссия. 1993. 29 красавіка.
8 Советская Белоруссия. 1993. 26 чэрвеня.
9 Советская Белоруссия. 1993. 29 красавіка.
10 Советская Белоруссия. 1993. 13 лістапада.
11 Тамсама.
12 Звязда. 1992. 25 лютага.
13 Звязда. 1993. 7 жніўня.
14 Звязда. 1993. 19 лістапада.
15 Звязда. 1993. 31 сакавіка.
16 Звязда. 1993. 1 ліпеня.
17 Звязда. 1993. 31 сакавіка.
18 Звязда. 1993. 13 лістапада.
19 Звязда. 1993. 16 сьнежня.
20 Тамсама.
21 Правда. 1994. 29 красавіка.
22 Тамсама.
23 Народная газета. 1994. 18—20 чэрвеня.
24 Аналітычны агляд эфірнай і камп’ютэрнай інфармацыі. Мн., 1994. № 64. 13—19 ліпеня. С.1.
25 Тамсама. С.3.
26 Тамсама.
27 Белорусская деловая газета. 1994. 8 жніўня.
28 Тамсама.
29 Белорусская деловая газета. 1994. 27 кастрычніка.
30 Звязда. 1994. 22 кастрычніка.
31 Народная газета. 1995. 23 сакавіка.
32 Народная газета. 1995. 23 сакавіка.
33 Народная газета. 1996. 29 сакавіка.
34 Тамсама.
35 Народная газета. 1996. 2 красавіка.
36 Народная газета. 1996. 20 кастрычніка.

[37] Народная газета. 1996. 15 лістапада.
[38] Советская Белоруссия. 1997. 12 сакавіка.
[39] Тамсама.
[40] Звязда. 1997. 19 сакавіка.
[41] Советская Белоруссия. 1997. 15 красавіка.
[42] Голас радзімы. 1997. 19 чэрвеня.
[43] Звязда. 1997. 24 сьнежня.
[44] Рэспубліка. 1998. 19 сьнежня.
[45] Независимая газета. 1999. 8 сьнежня.
[46] Белорусский рынок. 1999. № 26. С. 4.
[47] Рэспубліка. 1999. 29 кастрычніка.
[48] Рэспубліка. 1999. 18 сьнежня.
[49] Беларуская думка. 1999. № 6. С. 8.
[50] Рэспубліка. 1999. 9 красавіка.
[51] Рэспубліка. 1999. 23 лютага.
[52] Белорусский рынок. 1999. № 23. С. 6.
[53] Рэспубліка. 1999. 6 ліпеня.
[54] Беларуская думка. 1999. № 5. С. 7.
[55] Независимая газета. 1998. 17 лютага.
[56] Рэспубліка. 2000. 19 траўня.
[57] Рэспубліка. 2000. 23 чэрвеня.
[58] Рэспубліка. 2000. 1 сьнежня; Белорусский рынок. 2000. № 48. С. 4.
[59] Рэспубліка. 2000. 23 чэрвеня.
[60] Рэспубліка. 2001. 16 студзеня.
[61] Рэспубліка. 2001. 3 сакавіка.
[62] Рэспубліка. 2001. 22 траўня.
[63] Рэспубліка. 2001. 5 ліпеня.
[64] Рэспубліка. 2001. 7 чэрвеня.
[65] Белорусский рынок. 2001. № 50. С. 1.
[66] Рэспубліка. 2002. 5 студзеня.
[67] Белорусский рынок. 2002. № 12. С. 2.
[68] Вестник Министерства иностранных дел. 2001. № 4. С. 128.
[69] Известия. 2002. 9 лютага.
[70] К 10-летию образования Содружества Независимых Государств: итоги и перспективы. Мн., 2002. С. 52.